## ІДЭЙНА-СЭНСАВЫ ЗМЕСТ П'ЕСЫ К. КРАПІВЫ "БРАМА НЕЎМІРУЧАСЦІ"

А. У. Краўцова
БДПУ (Мінск)
Навук. кіраўн. – Н. В. Заяц, канд. філалаг. навук, дац.

**Анатацыя.** У артыкуле выяўляецца ідэйна-сэнсавы змест п'есы К. Крапівы "Брама неўміручасці". Паказваецца месца камедыі ў шэрагу твораў на інфернальную тэму.

**Ключавыя словы:** п'еса; камедыя; інфернальная тэма; персанаж; ідэя.

Кандрат Крапіва – адна з найбольш яскравых постацей у беларускай літаратуры. Дзякуючы пісьменніку ў айчынным слоўным мастацтве з'явіліся арыгінальныя, разнастайныя ў жанравых і праблемна-тэматычных адносінах творы.

Адным з апошніх мастацкіх тэкстаў драматурга стала напісаная ў 1976 годзе п'еса "Брама неўміручасці". Створаная неўзабаве пасля смерці блізкага чалавека – жонкі, народжаная асабістай стратай, п'еса выклікала шырокі грамадскі рэзананс. У камедыі ў жартоўным ключы ставіцца і вырашаецца "вечная" філасофская праблема – жыцця і смерці. Яшчэ раз засведчыўшы унікальны дар аўтара, камедыя з'явілася новым этапам у эвалюцыі інфернальнай тэматыкі ў нацыянальнай літаратуры.

Выкарыстанне інфернальных вобразаў і матываў мае даўнюю традыцыю ў беларускім прыгожым пісьменстве. Яшчэ ў XI–XIII стагоддзях, у эпоху Старажытнай Русі, былі вядомыя творы, дзе так ці інакш рэалізоўвалася замагільная тэматыка. Напрыклад, матыў наведвання іншасвету прадстаўлены ў апокрыфе "Хаджэнне Багародзіцы па пакутах". У творы расказваецца пра тое, як Багародзіца разам з архангелам Міхаілам і анёламі спусцілася ў пекла, прасіла ў Бога дараваць грэшнікам, Бог паслаў у пекла Хрыста. У апакрыфічнай "Аповесці пра стварэнне Богам Адама" сцвярджаецца, што ў стварэнні чалавека прымала ўдзел не толькі боская, але і д'ябалская сіла. У найбольш арыгінальным драматычным творы беларускага Асветніцтва "Камедыі" (1787) Каятана Марашэўскага адным з самых яркіх вобразаў выступае прадстаўнік іншасвету Чорт, які выпрабоўвае галоўнага героя Дзёмку. У XIX стагоддзі традыцыю звароту да інфернальнай вобразнасці працягнуў Ян Баршчэўскі. Яго кніга "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях" (1844–1846) шчыльна населена прадстаўнікамі іншасвету: цмокамі, ваўкалакамі, асташкаўцамі, чарнакніжнікамі. У XX стагоддзі ідэю спаборніцтва чалавека са смерцю ўвасобілі Змітрок Бядуля (аповесць-казка "Сярэбраная табакерка", 1940), Францішак Аляхновіч (п'еса "Круці не круці – трэба памярці", 1943), У. Караткевіч (аповесць "Ладдзя Роспачы", 1978) і інш.

Калі аўтары пералічаных твораў у вялікай ступені арыентаваліся на фальклорную традыцыю, то Кандрат Крапіва звяртаецца да сучаснай яму

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

рэчаіснасці. Аднак яго герояў цікавіць тая ж праблема: як супрацьстаяць смерці, як ашукаць яе.

У цэнтры пісьменніцкай ўвагі праблема магчымай бессмяротнасці. “Гіпатэтычнае адкрыццё неўміручасці дазваляла драматургу стварыць сусальную сцэнічную карціну ўсеагульнага трыумфавання, падарыць гледачам радасную казачку аб сусветным шчасці. Але скептычна-іранічны склад яго розуму прадыктаваў іншую мадэль твора: сатырычную камедыю. І не захацеў аўтар даваць усім неўміручасць, пабудаваўшы на шляху да яе браму” [2, с. 326], – падкрэслівае С. Лаўшук. Праз гэтую “браму” ў неўміручасць хочуць трапіць самыя розныя персанажы-тыпы, якія прадстаўляюць ці не ўсе слаі грамадства: ваенны пенсіянер Дажывалаў, гаспадарнік Караўкін, “нехта з былых” Торгала, шафёр Шусцік і інш.

Па словах П. Васючэнкі, “адкрыццё несмяротнасці, паводле Крапівы, няздатнае ашчасліваць чалавецтва. Яно пацягнула за сабой процьму праблем: дэмаграфічных, сацыяльных, псіхалагічных, этычных. Галоўная ж загваздка ў тым, што, як папярэджвае герантолаг Дабрыян, “неўміручасці на ўсіх не хопіць”. Яе, як і іншыя матэрыяльныя даброты, трэба размяркоўваць” [1, с. 8]. У абставінах вострай канкурэнтнай барацьбы нават у нармальных людзей, не кажучы ўжо пра абібокаў і прайдзісветаў, абудзілася помслівасць, ажыў эгаізм. Гэтыя метамарфозы яскрава ілюструе вобраз малодшага навуковага супрацоўніка Наташы. Асітэнтка і памочніца вынаходніка Дабрыяна, яна гатовая на ўсё, каб прайсці праз “браму”. Са сціплай дзяўчыны гераіня ператвараецца ў цыніка, пазбаўленага маральнага рэгулятара паводдзін: *“Дык вось... перш за ўсё пра ваш законны шлюб… Я на яго не замахваюся,* – выказвае сваю пазіцыю гераіня. – *Не патрабую разводу. Не падбухторваю, каб вы падсыпалі мыш‘яку Марыне Сяргееўне ці зжылі яе са свету якім-небудзь іншым спосабам. Марына Сяргееўна – мілая жанчына, і няхай яна здарова жыве, колькі ёй Бог вызначыў. Я пачакаю. Пры неўміручасці маладосць мая астанецца пры мне. Але ёй нашто неўміручасць? Чым яна яе заслужыла? І якая карысць грамадству ад таго, што яна не памрэ? Маладой яна ўжо не стане. Дзяцей вам нарадзіць не зможа. А вас прывяжа на векі вечныя. А вы ж маглі б падарыць чалавецтву таленавітых, можа, нават геніяльных нашчадкаў – дзяцей, унукаў, праўнукаў. Сваёй вечнай адданасцю старой бабе вы пазбаўляеце грамадства такога цудоўнага дару. Якая ж гэта мараль? Гэта старыя мяшчанскія забабоны, а не мараль неўміручага грамадства*” [3].

Драматург задаецца пытаннем маральнай падрыхтаванасці грамадства да навуковых вынаходніцтваў, адказнасці вучоных за зробленыя імі адкрыцці – пераводзіць традыцыйную для твораў на інфернальнай тэматыкі праблему супрацьстаяння жыцця і смерці ў інтэлектуальную сферу. Крапіва пераканальна паказвае, што чалавецтва пакуль не гатовае да падобнага выпрабавання, сцвярджаючы права людзей на смерць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такім чынам, ідэйна-сэнсавы змест камедыі Кандрата Крапівы “Брама неўміручасці” выяўляе новыя аспекты ў асэнсаванні інфернальнай праблемы, пашырае мастацкія далягляды, развівае і ўзбагачае нацыянальную традыцыю.

*Літаратура*


1. Васючэнка, П. Таямніца неўміручасці Кандрата Крапівы: да 115-годдзя з дня нараджэння / П. Васючэнка // Роднае слова. – 2011. – № 3. – С. 5–9.
2. Лаўшук, С. Кандрат Крапіва / С. Лаўшук // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Т. 2. – 2-е выд. – Мінск, 2002. – С. 282–329.
3. Крапіса, К. Брама неўміручасці / К. Крапіва [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.rulit.me/books/brama-neumiruchasci-read-315318-8.html. – Дата доступу: 10.02.2017.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ